Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

# САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ПЯТНІЦА 23 СЬНЕЖНЯ 1932 г.
№ 282 (3651)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-59
Адказн. сакратар 4-78
Сэкцыяў . . . 6-15
Прыёмная рэдакцыя 12-65
(пасля заняткаў)
Выдавецтва. . . 2-44

УМОВЫ ПОДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на пошце і літаносцамі.
Рукапісы не звяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.
КОШТ АБ'ЯВЫ: 1 радок номпарэлі 1 руб.
КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ: дакумэнту 16 згубе 2 руб.

## Сход партактыву г. Менску

23-га сьнежня а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дому Ка масьветы (былы клюб К. Маркса) склікаецца агульны сход партактыву гор. Менску з наступным парадкам дня:

1. Даклад аб ходзе сельска-гаспадарчых загатовак па БССР (дакладчык тав. ГІКАЛО).

Білеты на сход партактыву будуць выдавацца ў ГК КП(б)Б, пакой № 22, 23-XII з 10 да 3-х гадз. дня.

Для атрыманьня білетаў сакратары п-к і ячэек павінны прадставіць сьпісы па наступнай форме: прозьвішча, выконваемая работа, партстаж, партнагрузка.

Члены і кандыдаты ЦК КП(б)Б і Менгаркому КП(б)Б, члены ЦКК і Мен. гарКК, члены і канд рэвіз. камісій ЦК і Менгаркому праходзяць па сваіх мандатах.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

# НАКІРАВАЦЬ ЭНЭРГІЮ МАС НА БЯЗЬЛІТАСНУЮ БАРАЦЬБУ З КЛЯСАВЫМ ВОРАГАМ І ЯГО АГЕНТУРАЙ--АПАРТУНІСТАМІ

## Шматтысячны партыйны і савецкі актыў кінуць на штурм барацьбы за збожжа

## Пра абвяшчэньне БССР краінай суцэльнай пісьменнасьці

### Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Рабочая кляса і ўсе працоўныя Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, прышлі да XV года віны Кастрычніцкай рэвалюцыі з вялізарнейшымі посьпехамі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Беларусь, якая была эканамічна і культурна адсталай краінай былой царскай Расіі, цяпер зьяўляецца ад нэй з перадавых рэспублік вялікага Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Побач з вялізарнымі посьпехамі ў галіне індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, дзякуючы пасьлядоўнаму ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі, БССР мае грандыёзныя посьпехі ў галіне будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце.

БССР першая ў Саюзе ССР увяла ўсеагульнае абавязковае навучаньне на базе пачатковай школы і ў 1932 годзе ўвяла ўсеагульнае абавязковае навучаньне за сямігодку. Гэта стварае ўмовы для поўнага ажыцьцяўленьня праграмы камуністычнай партыі аб увядзеньні абавязковага палітэхнічнага навучаньня да 17-гадовага ўзросту. З краіны да рэвалюцыі няпісьменнай, з 70 проц. няпісьменнага працоўнага насельніцтва, БССР становіцца краінай суцэльнай пісьменнасьці: агульная пісьменнасьць з 30 проц. да Кастрычніцкай рэвалюцыі ўзьнята сёньня ва ўзросьце ад 16 да 45 год і рабочых і членаў прафэсіянальных саюзаў ва ўзросьце да 50—да 96,8 проц, а ў адносінах да ўсяго працоўнага насельніцтва — да 98 проц.

Уведзена ў гэтым годзе ўсеагульнае абавязковае навучаньне для малапісьменнага дарослага насельніцтва з адначасовым павышэньнем іх вытворчай кваліфікацыі.

Гэтыя посьпехі дасягнуты толькі дзякуючы Кастрычніцкай рэвалюцыі, правільнаму кіраўніцтву ленінскай камуністычнай партыі, бязьлітаснаму змаганьню з клясавым ворагам, брацкай дапамозе рабочае кляасы ўсяго Савецкага Саюзу, правільнаму ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі і барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з беларускім контррэвалюцыйным нацдэмакратызмам і шавінізмам іншых колераў.

Нячуваными ў сьвеце хуткімі тэмпамі БССР ліквідавала няпісьменнасьць — гэтую цяжкую спадчыну царызму і гэтым самым забясьпечана магчымасьць новым сотням тысяч працоўных стаць у рады яшчэ больш актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Выходзячы з гэтага, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абвясьціць Беларускую Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку краінай суцэльнай пісьменнасьці.

2. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы і раённым выканаўчым камітэтам на працягу гэтага на вучальнага году ліквідаваць рэшткі няпісьменнасьці і разгарнуць работу па поўным і свячасовым выкананьні дырэктыў аб ліквідацыі малапісьменнасьці.

3. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы разам з ЦСПСБ падаць сьпіс найбольш актыўных змагароў за ліквідацыю няпісьменнасьці для ўзнагароды.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.
Сакрэтар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

20-XII-32 г.

## Вялікая гістарычная перамога

Сёньня мы друкуем пастанову ўраду аб абвяшчэньні Беларускай ССР краінай суцэльнай пісьменнасьці.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б, пры дыктатуры пралетарыяту, БССР дасягнула буйных перамог на ўсіх вучастках нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Створана моцная прамысловасьць. Пасьпяхова праводзіцца сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі. Па ўсіх відах народнай асьветы дасягнуты посьпехі, якія магчымы толькі тады, калі гаспадаром краіны зьяўляецца рабочая кляса. БССР ПЕРШАЯ Ў САВЕЦКІМ САЮЗЕ ЎВЯЛА ЎСЕАГУЛЬНАЕ АБАВЯЗКОВАЕ НАВУЧАНЬНЕ НА БАЗЕ ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЫ. Уведзены ўсенавуч за 7-мігодку. Уведзены ўсенавуч дарослага працоўнага насельніцтва, чого ня мае ніводная капіталістычная краіна. Для ўсіх нацыянальнасьцяй, якія насяляюць БССР, забясьпечана навучаньне на роднай мове. Створана Акадэмія навук, Дзяржаўны унівэрсытэт, цэлы рад вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў. Гістарычную перамогу атрымалі рабочыя і працоўныя масы БССР у барацьбе са спадчынай царызму—няпісьменнасьцю. У Беларусі—былой царскай паўкалёніі—пісьменнага насельніцтва было ня звыш 30 проц. Сёньня рабочыя і працоўныя масы Савецкай Беларусі з гонарам заяўляюць пралетарыяту ўсяго сьвету, што—пісьменнасьць у БССР узьнята да 98 проц. у адносінах да ўсяго працоўнага насельніцтва.

Гэтая перамога дасягнута ў нябачна хуткі тэрмін, дзякуючы няўхільнаму ажыцьцяўленьню генэральнай лініі партыі. Яна зьяўляецца вынікам правільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, непрымірымай барацьбы з вялікадзяржаўным ухілам як галоўнай небясьпекай, з беларускім контррэвалюцыйным нацдэмакратызмам, з шавінізмамі ўсіх колераў.

Контррэвалюцыйныя беларускія нацдэмакраты імкнуліся зьнішчыць дыктатуру пралетарыяту, аднавіць капіталістычны лад у БССР.

Для выкананьня сваёй мэты яны імкнуліся дабіцца тармажэньня тэмпаў ліквідацыі няпісьменнасьці. Паводле плянаў нацдэмаў ліквідацыя няпісьменнасьці не разгортвалася, а стрымлівалася. Так, у 1928—29 г. намячалася навучыць 109 тысяч няпісьменных, у 1930-31 г. таксама 109 тысяч, а затым... 95, 91 і нарэшце ў 1935 годзе... 71 тысячу.

Партыя разграміла контррэвалюцыйны нацдэмакратызм, забясьпечыла бальшавіцкім тэмпы ў барацьбе з няпісьменнасьцю. У 1930-31 г. праведзена ліквідацыя няпісьменнасьці сярод 300 тысяч чалавек, у 1931-32 г.—сярод 200 тыс.

Крызіс, які ахапіў увесь капіталістычны сьвет, які зьяўляецца крызістычны сьвет, які зьяўляецца крызісам усяе капіталістычнае сыстэмы, разбурае ня толькі капіталістычную гаспадарку, але і капіталістычную культуру. Заходняя Беларусь, якая зьяўляецца калёніяй фашысцкай Польшчы, дае яскравы малюнак заняпаду і гаспадаркі, і культуры. Няпісьменнасьць у ЗБ, як і ў царскія часы, даходзіць да 72 пр. У 1918-19 гг. на Заходняй Беларусі было звыш 400 беларускіх школ, 7 гімназій, 2 настаўніцкія сэмінарыі, пэдкурсы ў Вільні і Горадні. Зараз—у ЗБ няма ніводнай беларускай пачатковай школы і гімназіі. Ёсьць толькі 24 польска-беларускія пачатковыя школы. Гэтыя лічбы—крамоўныя сьведкі нацыянальнага ўціску, палітыкі полёнізацыі польскага фашызму.

Ператварэньне БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці забясьпечвае магчымасьць новым сотням тысяч працоўных яшчэ больш павялічыць сваю актыўнасьць, свой удзел у кіраўніцтве дзяржавай, у сацыялістычным будаўніцтве, у пабудове бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Абвяшчэньне БССР краінай суцэльнай пісьменнасьці супадае з ваходам краіны ў другую пяцігодку. Гэты факт яшчэ вышэй узьнімае значэньне дасягнутай перамогі, бо суцэльная пісьменнасьць зьяўляецца адной з умоў для бальшавіцкага вырашэньня сусьветна-гістарычных задач, пастаўленых партыяй у другой пяцігодцы: пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

Але-ж каб з посьпехам вырашыць задачы другой пяцігодкі—аднэй пісьменнасьці мала. «Недастаткова ліквідаваць няпісьменнасьць, але трэба яшчэ будаваць савецкую гаспадарку, а пры гэтым на аднэй пісьменнасьці далёка не паедзеш. Нам трэба вялізарнае павышэньне культуры, трэба каб чалавек на справе карыстаўсь ўменьнем чытаць і пісаць» (Ленін).

Пераважаемы намі пэрыяд з асаблівай вострасьцю патрабуе павышэньня пісьменнасьці, уладаньня тэхнікай, добрага асваеньня і веданьня вытвор часьці. Сацыялістычная рэканструкцыя ўсяе народнае гаспадаркі, павялічэньне перадавой тэхнікі пад усе галіны вытворчасьці ставяць ва ўвесь рост задачу хутчэйшай ліквідацыі рэшткаў няпісьменнасьці, разгортваньня ўсенавучу малапісьменнага дарослага насельніцтва, патрабуюць ад кожнага працоўнага вучобы і працы над сабой. На III зьезьдзе камсамолу Ленін гаварыў: «Вы добра разумееце, што да электрыфікацыі няпісьменныя людзі не падыдуць і мала тут аднэй простай пісьменнасьці. Тут мала разумець, што такое электрычнасьць, трэба ведаць, як тэхнічна прыкласьці яе да прамысловасьці і да земляробства, і да паасобных галін прамысловасьці і земляробства. Трэба вывучы і па гэтаму самім, трэба навучыць гэтаму ўсё падрастаючае працоўнае пакаленьне».

Партыя практычна ажыцьцяўляе ўказаньні Леніна. Адна з важейшых задач усенавучу малапісьменных—палітэхнічна-вытворчае навучаньне, падрыхтоўка, кадраў масавых прафэсій. Пачынаецца практычнае ажыцьцяўленьне праграмы партыі аб усенавучу за 10-ці гадовую школу.

Падрыхтоўка да гадавіны Леніна скарыстана для мабілізацыі мас на вырашэньне задач культурнага будаўніцтва, за разгортваньне культуры сацыялістычнай па зьмесьце, нацыянальнай па форме.

## ПАКАЗАЦЬ ЛЕПШЫХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА ЗБОЖЖА

### Ганьба носьбітам абломаўскіх тэмпаў

### АРГАНІЗАТАРЫ ПЕРАМОГІ

(З лістоў у рэдакцыю)

**КАЛГАС „ПАЕЕДА“**, Горацкага раёну ў гэтым годзе вызвален ад збожжазагатовак. Аднак улічваючы на ружанае становішча з выкананьнем пляну збожжазагатовак, калгасьнікі здалі дабраахвотна 14 цэнт. збожжа.

**КАЛГАС „ПРАГРЭС“**, Клецкінскага сельсавету (Сіроцінскі раён), ужо перавыканаў усе віды загатовак: паво ле пляну трэба было здаць лёнавалакна 2.2 цнт., здана 2,3, лёна семя 14 цнт., здана—15 цнт. Збожжа выкана на на ўсе 100 проц. Страхавы фонд засыпан і ачышчан на ўсе 100 проц.

**АЛНА'СОБНЫ СЭКТАР** Дзерацеўскага сельсавету (Асіпавіцкі раён) выканаў сваё заданьне на 119 7 проц.

**АДНААСОБНІКІ ПАСЁЛКУ** Забуцькі, Асіпавіцкага раёну, у парадку рэалізацыі рашэньня сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б усе як алзін ліквіда ал сваю запазы ан сьць па бульбе і збожжы. Здана 13 цнт збожжа, 60 цнт бульбы.

Калгасьнікі калгасу „Вална“, Сарагоўскага сельсавету (Слуцкі р ён), бачачы, што к лацка заможная частка зрывае пляны загатовак, каб стварыць труднасьці ў рабочым забясьпечаньні здалі дадаткова звыш пляну 10 цнт збожжа.

**З ХОЦКІ СЕЛЬСАВЕТ**, Шклоўскага раёну, датэрмінова выканаў збожжазагатоўкі на 102 проц. За ўдарную работу, за ўмен не мабілізаваць масы на выкананьне дзяржаўных загатов к старшыня гэтага-ж сельсавету Алексяёнка прэміяваны 100 руб.

**КАЛГАС „БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА“**, Віраўлянскага сельсавету (Гарадоцкі раён), поўнасьцю выканаў плян леназагатовак. Здана 15 7 цнт лёнавалакна замест плянавых 15. У парадку самаабавязацельстваў калгас здаў звыш пляну 2 цнт збожжавых культур. Калгас „Беларуская вёска“ узяў на буксір калгас імя Сталіна гэтага ж сельсавету, які значна адстае у збожжазагатоўках.

**У АДЗНАКУ 15 ГОДЗЬДЗЯ** існаваньня органаў ДПУ рад калгасаў Чырвонаслабодзкага раёну арганізавалі сацыялістычныя падарункі. Калгас „З ці рашаючы“ здаў 1 карова, калгас „XII-годзьдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі“—1 сьвінаматку, калгас „Чырвоны партызан“—1 цёлку, калгас „КІМ“—1 карову, калгас „Чырвоная Слабада“—1 сьвінаматку з пар сятамі.

* * *

Вось яны, перадавікі, энтузіясты сацыялістычнай будоўлі, якія добра ўсьвядомілі сабе ўсё палітычнае і гаспадарчае значэньне своячасовага выкан ньня плянаў з гатовак.

Іх вопыт—вопыт лепшых, іх мэ ады—мэ ады лепшых павінны пераняць усе астатнія. На прыкладзе перадавых вучацца перам гаць адстаючыя вуча ткі. Тыя калгасы, сельсаветы, р ёны, якія своячасо а выканалі пляны загатовак, паказалі сваю здольнасьць змагацца за генэральную лінію партыі, за выкананьне тых задач, якія пастаўлены перад імі партыяй і ўрадам.

Бяць перадавымі, застрэльшчыкамі на ўсіх фронтох сацыялістычнага будаўніцтва, выконваць ня толькі самім свае абавязкі але да змагаць і адстаючым, дамагацца 100-проц нтнага выканаьня ў агульна рэспу ліканскім маштабе так, і толькі т к можа стаць пытаньне ў справе барацьбы за выкананьне дзяржаўных заг товак.

### САБАТАЖНІКІ ЗАГАТОВАК

(З лістоў у рэдакцыю)

**БАНДАРЧУК САМУІЛ**—моцны серадняк вёскі Дзесінай (Бабруйскі раён) да гэтага часу ня здаў 25 пудоў бульбы і ня выканаў свайго заданьня па збожжы.

**НАВІЦКІ ПЁТРА** (Вітуньскі сельсавет, Бягомльскага раёну) даведаны плян у 31 пуд. збожжа ня здаў. Ён падрабіў мінулагодні квіт. Злачынства выкрыта.

**ФІРАГА ЯНКА** (гэты-ж сельсавет) агітуе супроць здачы збожжа. — „Не з авайце, у мінулым годзе не здалі, так і абыйшлося, мо' абыйдзецца і зараз“.

**ПАТАШОЎ ЯЛІСЕЙ** з в. Усушкі (Усушскі сельсавет, Чаўскага раёну), будучы вартаўніком калгаснага сьвірну, тайком адчыняў сьвіран, краў збожжа і спэкуляваў на базары ў Магілеве.

**КАЦ ІЦКА** — былы ўласьнік млыну, зараз працуе на млыне калгасу „Пралетарская Перамога“ (Зембінскі сельсавет, Барысаўскага р ёну). Ён не дае квіткі на атрыманы памольны збор, а ссыпае гэтае зерне ў мяхі і спэкулюе збожжам на рынку ў Барысаве.

**КАВАЛЁЎ**, старшыня калгасу „Чакіст“, Каменскага сельсавету, (Барысаўскі раён) быў затрыманы ў Барысаве на рынку, куды ён прыйшоў прадаваць паўтара цэнтнэры збожжа. Аб гэтых фактах ведае партячэйка і сельсавет, але ніякіх мер ня прымаюць.

**АНУШКЕВІЧ** — член Негаўскага сельсавету, Барысаўскага раёну да гэтага часу ня выканаў сваіх плянаў па збожжазагатоўках. Ён сьвядома тармозіць выкананьне плянаў збожжа ў в. Забалоціна, да якой ён прымацаваны.

**КАЛГАС „ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ“** (Шугалеўскі сельсавет) не здаў ніводнага кілёграма лёну. Старшыня калгасу Васілёнак на запытаньне —чаму калгас ня выконвае плян,—адказвае: „Лён мы разьмеркавалі паміж калгасьнікамі ў часе ўбо,кі, а частка ляжыць яшчэ нецёртай“.

* * *

Вось яны, хто зрываюць выкананьне дзяржаўных пляназагатовак. Кулак, падкулачнік, спэкулянт, злодзей імкнуцца нанесьці шкоду краіне саветаў. Яны імкнуцца сарваць пляны загатовак.

Кулак і яго агентура — спэкулянт, перакупшчык, злодзей, якія раскрадаюць дзяржаўную маемасьць, той, хто злосна сабатуе і зрывае загатоўкі, павінен атрымаць самы рашучы адпор. Аніякай літасьці клясаваму ворагу.

Той, хто патурае кулаку, хто грае на руку клясаваму ворагу, хто ня выконвае сваіх плянаў, не жадае мабілізаваць масы на выкананьне дзяржаўных плянаў, той сам вораг народу. Яны павінны сесьці на лаву падсудных яны ня могуць стаяць на чале кіраўніцтва пэўным вучасткам работы, яны ня здольны змагацца за генэральную лінію партыі. — Так, і толькі так стаіць пытаньне

## Тав. Галадзед у Смалявічах

СМАЛЯВІЧЫ. (Па тэлеф. ад наш. кар.). У Смалявічы прыбыў старшыня СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕД.

21 сьнежня ў м. Смалявічах адбылася нарада партыйнага актыву. Па пытаньні ажыцьцяўленьня рашэньняў сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б у справе выкананьня плянаў усіх відаў загатовак да тэрміну, на нарадзе выступіў старшыня СНК тав. ГАЛАДЗЕД.

Удзельнікі нарады мабілізаваліся на поўнае выкананьне плянаў загатовак усіх відаў.

22 сьнежня тав. ГАЛАДЗЕД выехаў у Драчкаўскі сельсавет для азнаямленьня з ходам выкананьня плянаў загатовак і дапамогі.

П. КАВАЛЁЎ.

## Ход выкананьня гадавога рэспубліканскага пляну па збожжы

(у проц.)

| на 15-га сьнежня | | на 20-га сьнежня | |
|---|---|---|---|
| Калгасы | 72,3 | Калгасы | 77,8 |
| Аднаасобнікі | 58,1 | Аднаасобнікі | 62,3 |
| У тым ліку цьвёрдыя заданьні | 40,4 | У тым ліку цьвёрдыя заданьні | 49,9 |
| Усяго па БССР | 62,6 | Усяго па БССР | 67,6 |

## Пра рэзультаты праверкі выкананьня рашэньня ЦК УсеКП(б) ад 5 верасьня 1931 г. па пытаньні аб снабжэньні настаўнікаў і іх сем'яў

### Пастанова Прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і калегіі НК РСІ СССР ад 14-XII году

Прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) і калегія НК РСІ СССР канстатуюць: што важнейшая дырэктыва партыі аб снабжэньні настаўнікаў і членаў іх сем'яў, як устаноўлена абсьледваньнем ЦКК УсеКП(б)—НК РСІ СССР і мясцовым органам КК—РСІ, выконваецца надзвычайна нездавальняюча, асабліва ў сельскіх мясцовасьцях.

З прычыны гэтага прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) і калегія НК РСІ СССР пастанаўляюць:

1. Абавязаць НКСнаб СССР, Цэнтрасаюз, НКЗем СССР устанавіць сыстэматычны кантроль за поўным і дакладным правядзеньнем у жыцьцё рашэньняў ЦК УсеКП(б) ад 5 верасьня 1931 г і СПА ад 28 кастрычніка 1931 г. аб снабжэньні настаўнікаў і членаў іх сем'яў харчамі і прамтаварамі.

Абавязаць НКСнаб СССР, Цэнтрасаюз і НКЗ СССР у дэкадны тэрмін вылучыць спэцыяльных работнікаў, ад казных за правядзеньне ў жыцьцё па становы аб снабжэньні настаўнікаў.

2. Прыняць да ведама заяву НКСнабу СССР, што для правядзеньня ў жыцьцё рашэньня ЦК УсеКП(б) ад 5 верасьня 1931 году аб снабжэньні настаўнікаў, ім устанаўляецца наступны парадак: а) штоквартальна па кварталных і месячных плянах будуць вызначацца спэцыяльныя фонды па вобласьцях для снабжэньня настаўнікаў і іх сем'яў па збожжы, крупе, цукру і чаю;

б) на органы снабжэньня і спажкапэрацыі будуць ускладзены абавязкі вызначыць для снабжэньня настаўнікаў і членаў іх сем'яў неабходны фонды прамтавараў з агульных фондаў прамтавараў, якія накіроўваюцца ў край, вобласьць і раён;

в) на органы снабжэньня і спажкапэрацыі будзе ўскладзены абавязак па дачы пэрыядычных зводак аб ходзе снабжэньня настаўнікаў.

Абавязаць НКСнаб СССР пэрыядычна падаваць зводкі па снабжэньні настаўнікаў у ЦКК УсеКП(б)—НК РСІ СССР.

3. Абавязаць НКАсьветы РСФСР (пад адказнасьць намаркамасьветы РСФСР тав. Мілюціна) разам з ЦК саюзу штоквартальна своячасова падаваць НКСнабу СССР весткі аб колькасьці настаўнікаў і членаў іх сем'яў па паасобных вобласьцях і краёх з разьбіўкай іх на гарадзкія кантынгенты, сельскія кантынгенты і прымацаваньне настаўнікаў у сельскіх мясцовасьцях да калгасаў і саўгасаў, а ў гарадох да фабрычна - заводзкіх снабжаючых арганізацый.

4. У адпаведнасьці з пастановаю СПА ад 28-X-31 г. усклаcьці адказнасьць за арганізацыю снабжэньня настаўнікаў і іх сем'яў у сельскіх мясцовасьцях (утварэньне мясцовых фондаў снабжэньня, прасьлянае накіраваньне цэнтралізаваных рэсурсаў, кантроль за выкананьнем фондаў па прыналежнасьці) на райвыканкомы, райсны бы і райспажсаюзы, які жыцьцяўляюць гэтае снабжэньне праз сельскую спажкапэрацыю (сельспажтаварыства).

5. Абавязаць НКАсьветы РСФСР распрацаваць сумесна з Цэнтрасаюзам і ЦК саюзу працасьветы мерапрыемствы па стварэньні дадатковай харчовай базы для настаўнікаў і вучняў (гарачы сьнеданьні ў школах) у прышкольных сялібных вучастках, а таксама шляхам арганізацыі ў раёнах праз спажкапэрацыю і органы народнае асьветы самадзейных гародаў і г этак далей.

Увайсьці ў СПА з праектам прапановы па гэтым пытаньні ў месячны тэрмін.

6. Прыняць даведама, што пастановамі раду КК РСІ (Украіна, Горкаўскі край і Сярэдняя Волга) на асоб, якія вінаваты ў невыкананьні пастановы ЦК УсеКП(б) і СПА аб снабжэньні настаўнікаў, накладзены адпаведныя спагнаньні (абвешчана вымова члену калегіі НКСнабу Украіны тав. Бэрэліну, зьняты з работы заг. масавага аддзелу Калгасцэнтру Украіны тав. Чарняўскі, абвешчана вымова фракцыі райспажсаюзу Пачыкаўскага раёну (Горкаўскі край), абвешчана вымова заг. райснабу таго-ж раёну тав. Хрушчову і іншым).

7. Адзначыць, што з боку былога старшыні Калгасцэнтру тав. Татаева, ня гледзячы на ўказаньні камісіі выкананьня пры СНК СССР, ня былі прыняты захады да забясьпечаньня выкананьня рашэньня партыі і ўраду аб снабжэньні настаўнікаў. Папярэдзіць т. Татаева, што ў выпадку паўтарэньня падобных зьяўішч да яго будуць ужыты суровыя меры спагнаньня.

8. Адзначаючы недастатковасьць кантролю з боку мясцовых КК РСІ за выкананьнем рашэньняў ЦК УсеКП(б) і СПА аб снабжэньні настаўнікаў, прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) і калегія НК РСІ СССР абавязваюць мясцовыя органы КК РСІ ўстанавіць стары непаслабны кантроль і нагляд за правядзеньнем у жыцьцё рашэньняў ЦК УсеКП(б) аб снабжэньні настаўнікаў, зьвярнуць асаблівую ўвагу раённых КК РСІ на неабходнасьць стараннага кантролю за выкананьнем раённымі арганізацыямі параграфу 4 гэтай пастановы. Усклаcьці на райКК РСІ побач з гаспорганамі адказнасьць за нескарыстаньне па непасрэдным прызначэньні фондаў, вызначаных для настаўнікаў.

## Ворагам народу--расстрэл

16-га сьнежня ў Клімавічах выязная сэсія судовай калегіі Вярхсуду БССР разьбірала справу супрацоўнікаў саўгасу імя XVI партзьезду па абвінавачваньні іх у раскраданьні сацыялістычнай маемасьці.

Да адказнасьці прыцягнуты: дырэктар саўгасу Ігнат Сьцепаненка, яго намесьнік Мыглякоў Кастусь, зоатэхнік Грыневіч Міхась, кладаўшчык саўгасу Сьцепаненка Трафім, вартаўнік саўгасу Мыглякоў Герасім і рад іншых.

Гэтая зграя шкоднікаў і зладзеяў на працягу студзеня-чэрвеня месяцаў гэтага году, карыстаючыся тым, што яны мелі доступ у любы час дня і ночы ў гумны саўгасу, бо вартаўніком быў свой чалавек—бацька намесьніка дырэктара саўгасу—Кастусь Мыглякоў, раскралі 6938 кг. кукурузы, 4651 кг. проса, 372 кг. пшаніцы, 917 кг. жыта, 195 кг. ячменю, 228 кг. вопрубей і 83 кг аўса. Частка пакрадзенага збожжа Кастусь Мыглякоў і Герасім Мыглякоў скарысталі на адкорм сваіх уласных сьвіней і іншай жывёлы. Пры правяденьні рэвізіі аказаўся недахоп ураджаю 80723 кг. збожжа.

У выніку шкодніцкай работы шайкі зладзеяў-раскрадальнікаў грамадзкай уласнасьці, саўгас імя XVI партзьезду ў кароткі час панёс значныя страты.

Адсутнасьць усялякага кіраўніцтва і нагляду за стадам выклікалі ў сьвінарніках эпідэмічную хваробу, ад якой пала 600 штук сьвіней—значная колькасьць сьвінаматак і маладняка.

Выходзячы з гэтага, выязная сэсія Вярхоўнага суду прыгаварыла:

Герасіма Мыглякова да пазбаўленьня волі на 10 год у адлеглых мясцовасьцях СССР, з канфіскацыяй усёй належачай яму маемасьці, Кастуся Мыглякова і Ігната Сьцепанавіча, як ворагаў народу, да вышэйшай меры сацыяльнай абароны — расстрэлу з канфіскацыяй усёй маемасьці. Прыгавор прыведзены ў выкананьне.

М—кі.

## Кулацкага агента Пшонка—да адказнасьці

ЛЕПЕЛЬ. Калгас „Чырвоная Эса“, Сьвяцкага сельсавету плян здачы (збожжа) дзяржаве абожжа выканаў толькі на 70 проц. Старшыня калгасу Пшонка М. стаў на шлях сабатажу, зрыву збожжазагатовак. Гэты кулацкі агент пад маркай старшыні калгасу заяўляе: «Збожжа лепш змалоць для цялят, чым здаваць дзяржаве».

Варожай дзейнасьці Пшонкі М. павінен быць даны рашучы адпор. Кулацкі агент павінен панесьці суровае пакараньне.

Калгас «Чырвоная Эса», на выязку клясавага ворага, павінен адказаць 100-процантным выкананьнем пляну збожжазагатовак у бліжэйшыя дні.

А. Налётны.

## Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

### Аб невыкананьні саўгасамі пляну здачы дзяржаве плодагародніннай прадукцыі

У дадатак да рашэньня СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 20 сьнежня (прат. № В-30 1) СНК БССР і ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Былога дырэктара саўгасу «Буйнічы» (Магілеўскага раёну)—САКАЛОВА за ўтворацы продаж на рынак 145 тон плодагародніны пры невыкананьні саўгасам пляну здачы дзяржаве плодагародніннай прадукцыі (плян 420 тон, здана 271 тон)—з радоў партыі выключыць.

Прыняць да ведама паведамленьне Упаўнаркамсаўгасаў—т. Мясокова аб тым, што Сакалоў з работы зьняты і аддадны пад суд. Даручыць пракуратуры ў трохдзённы тэрмін скончыць судовую справу на Сакалова.

2. Дырэктара саўгасу «Брылёва» (Гомельскага раёну)—ЕШЧЫНА за продаж 73 тон плодагародніны на рынак пры невыкананьні саўгасам пляну здачы дзяржаве плодагародніны (плян 1055 тон здана 593 тоны)—з работы зьняць і аддаць пад суд. Даручыць т. Судакову ў трохдзённы тэрмін закончыць справу на Ешчына, а ЦККК у гэты-ж тэрмін вырашыць пытаньне аб яго партыйнасьці.

3. Былому дырэктару саўгасу «Яроміна» (Гомельскага раёну)—ПРАСАВУ за продаж 37 тон плодагародніны на рынак пры невыкананьні саўгасам пляну здачы дзяржаве плодагароднінай прадукцыі (плян 190 тон, здана 136 тон) абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем.

Абавязаць новага дырэктара саўгасу «Яроміна» т. Карпенку выканаць плян здачы дзяржаве плодагароднінай прадукцыі—не пазьней 25-XII г. г.

4. Дырэктару саўгасу «Жмураўка» (Рэчыцкага раёну)—ЛЯСКАЎЦУ за нядрыняцьце ўсіх неабходных мер да своячасовага выкананьня пляну здачы дзяржаве плодагароднінай прадукцыі—абвясьціць суровую вымову, папярэдзіўшы, што ў выпадку невыкананьня пляну здачы плодагарод. прадукцыі да 25-XII г. г. ён будзе выключаны з партыі і аддадзены пад суд.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД
Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО

ЦК УсеКП(б) з глыбокім жалем паведамляе аб сьмерці тав.

# Курскага Д. І.

старога бальшавіка, актыўнага работніка нашай партыі.

ЦК УсеКП(б).

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР з глыбокім жалем паведамляе аб сьмерці члена ЦВК СССР

# Дзьмітрыя Іванавіча КУРСКАГА

старога бальшавіка, былога паўнамоцнага прадстаўніка Саюзу ССР у Італіі.

## ПАМЯЦІ Д. І. КУРСКАГА

У асобе нябожчыка Дзьмітрыя Іванавіча КУРСКАГА мы страцілі старога бальшавіка, нясупынна працаваўшага на адказнейшых вучастках нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Усё жыцьцё ён аддаў барацьбе за справу пралетарыяту. Яшчэ ў 1895 годзе 19 гадовым юнаком ён заарыштаваны царскім урадам за студенцкія непарадкі. Скончыўшы ўніверсытэт, ён працягвае весьці падпольную работу. У бурным 1905 годзе ён у радах удзельнікаў Маскоўскага ўзброенага паўстаньня. У лютаўскую рэвалюцыю ён старшыня савету салдацкіх дэпутатаў 4-й армії. У Кастрычніцкай рэвалюцыі ён на баявым посту рэвалюцыі—ён жа зьяўляецца кіраўніком і арганізатарам савецкай юстыцыі, займаючы пост Наркома Юстыцыі. Ва ўсіх справах, якія яму даручала партыя, Дзьмітры Іванавіч КУРСКІ праявіў сабе, як стойкі і прыдатны работнік, тым больш балюча яго страта, поўнага сіл, у сучасны перыяд разгортваньня вялікага сацыялістычнага будаўніцтва.

КУЙБЫШАЎ, ЛЮБІМАЎ, В. МІЛЮЦІН, Г. Г. КРЖЫЖАНОЎСКІ, Г. Г. ЛЕПЛЕЎСКІ і КРАСІКАЎ.

# За сабатаж лёназагатовак адданы пад суд і выключаны з партыі

## старшыня калгасу „Маяк" ТАРНОЎСКІ і палявод ЛАЎРЫКОВІЧ

„ЧЛЕНАЎ СЕЛЬСАВЕТАЎ, ЯКІЯ САМІ ЗЛОСНА НЯ ВЫКОНВАЮЦЬ ЗАГАТОВАК, ЯКІЯ ПАД УПЛЫВАМ КУЛАЦКА-ВАРОЖЫХ ЭЛЬМЭНТАЎ САБАТУЮЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ІХ ВУЧАСТКАМІ ЗАГАТОВАК—ТЭРМІНОВА ПЕРААБРАЦЬ, АДДАЦЬ ПАД СУД ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК". (З пост. ЦВК БССР)

## Прымусіць кулакоў Кандратава, Голубава, Раманава выканаць загатоўкі

РАГАЧЭЎ. Па Мала-Стралкоўскім сельсавеце лёназагатоўкі не разгорнуты, спагнаньне па цьвёрдых заданьнях праходзіць вельмі марудна. Кулак, карыстаючыся бязьдзейнасьцю сельсавету і партыйнэйкі, ухіляецца ад выкананьня пляну. На сёньняшні дзень плян па цьвёрдых заданьнях на лёнавалакно выкананы толькі на 49 проц., на семя—50 проц. Злосна ня выконваюць цьвёрдых заданьняў заможныя Кандратаў Апанас, Голубаў Язэп, Раманаў Ільля.

Калгасны сэктар гэтага сельсавету таксама адстае па лёназагатоўках. Так, калгас—«Іскра сацыялізму», які паводле пляну павінен здаць (прадаць) 13 цэнт. лёнатрасты і валакна, на сёньняшні дзень ня здаў ніводнага кілё лёнапрадукцыі. Праўленьне калгасу замест бальшавіцкай арганізацыі апрацоўкі лёну, працягвае апарэтуністыную балбатню, што «няма калёс для перавозкі лёнатрасты, няма коняй і г. д.».

Ня лепш в лёназагатоўках і ў калгасе «Перамога». Гэты калгас павінен здаць 146,5 цэнт. лёнатрасты і 33 цэнт. семя, але пакуль што калгас упарта не растачынае загатовак. Тлумачыцца гэта выключна тым, што былыя заможныя Абрамовіч Хведар, Лапіцкі Якім і інш. вядуць сярод калгасьнікаў агітацыю супроць выкананьня абавязкаў перад дзяржавай. Праўленьне калгасу, падпаўшы пад уплыў заможнікаў, ня здолела мабілізаваць актыў на ўдарнае завяршэньне лёназагатовак.

Гэтым правям варожай кулацкай дзейнасьці, імкненьням кулакоў і іх агентаў сарваць плян тэхкультур трэба даць самы рашучы адпор. Зрыў прычынкі загатовак—«кулаччо і заможнікі»—павінны быць бяз лішніх слоў кіры цягнуты да судовай адказнасьці. Плян лёназагатовак па М-Стралкоўскім сельсавеце трэба выканаць, у тэрмін, вызначаны партыяй і ўрадам.

А. Куляшоў.

## Ачысьціць Вушацкі лёназавод ад перараджэнцаў і злачынцаў

ВУШАЧЫ. Вушацкі лёназавод засьмечаны чужым элемэнтам. Апартуністы Стаховіч, Кавасты і перараджэнцы Стаховіч, Каваленка, Латышоў і іншыя вядуць завод да развалу.

У выніку шкодніцкай дзейнасьці гэтай кампаніі, прамфінплян гэтага году выканаць толькі на 48 проц. Паводле пляну, завод павінен быў да 1-га кастрычніка пераапрацаваць усю трасту, але фактычна, засталося не пераапрацавана 60 тон трасты, палова якой згніла ўшчэнт.

Безгаспадарчасьць на заводзе даведзена да таго, што на складзе засталося ляжаць 20 тон лёнавалакна у той час, як сацыялістычная прамысловасьць патрабуе сыравіны. Злачынае замарожваньне прадукцыі затрымала выплату рабочым пэнсіі на працягу трох месяцаў.

Дырэктар заводу Стаховіч зусім ня кіруе заводамі. Увесь час праводзіць або ў разьездах, або на паляваньні. Завод застаўся без апалу і вады. Па віне Стаховіча на заводзе частыя прастоі, рабочыя прымушаны пакідаць работу і езьдзіць ў лес за апалам.

Паўстае пытаньне, дзе была партячэйка, на вачох у якой рабіліся гэтыя агідныя ўчынкі? Трэба сказаць зусім адкрыта, што ячэйка загрузла ў апартуністычным балоце.

Грамадзкае харчаваньне дрэннае. Загадчыкам сталоўні прызначаны цьвёрдазаданьнік Латышоў, які сумяшчае спрыяе паглыбленьню прарыву.

У рабоце лёназаводу запанавала сямейнасьць і кругавая парука. Заўком Каваленка сумесна з Стаховічам штодзенна ладзяць п'янкі.

Усе гэтыя агідныя зьявішчы былі вядомы раённым арганізацыям, але на мусьці ніхто на гэта не зварочвае ўвагі.

Кучка п'яніц лодыраў і апартуністаў на чале з дэрыктарам Стаховічам павінна сесьці на лаву падсудных і адказваць перад пралетарскім судом за свае ўчынкі.

Брыгада друку: СІВАКОЎ і ФІЛІМОНАЎ.

## За зрыў лёназагатовак вон з партыі

ЛЕПЕЛЬ, 17-га сьнежня бюро ЛЕПЕЛЬСКАГА РК КП(б)Б і прэзыдыум РКК абгаварылі пытаньне ходу збожжа і лёназагатовак. На 15-е сьнежня плян па лёнавалакне выкананы ўсяго на 31,3 проц.

Бюро РК і прэзыдыум РКК КП(б)Б прызналі ход загатовак нездавальняючым і ўжылі рад практычных мерапрыемстваў, якія забясьпечылі-б выкананьне лёназагатовак на 80 проц. і па збожжы на 100 проц. не пазьней, як да 26 сьнежня.

За зрыў лёну і збожжазагатовак, за ўтойваньне валакна выключаны з партыі і аддаены пад суд старшыня калгасу «МАЯК» ТАРНОЎСКІ Я. і палявод ЛАЎРЫНОВІЧ Я.

За зрыў загатовак накладзены спагнаньні і ў адносінах раду іншых работнікаў. Старшыні СЬВЯДЗКАГА сельсавету ЮДЗЕНКА абвешчана вымова. За слабае кіраўніцтва, дрэнную расстаноўку сіл і зрыў загатовак. Сак ратару ВАЛОСАЎСКАЙ ячэйкі КП(б)Б СУДАКОВУ і ўпаўнаважанаму РК і РВК па Валосаўскім сельсавеце ПШАНІЦЫНУ таксама абвешчаны вымовы.

Пад адказнасьць старшынь сельсаветаў і сакратароў ячэек бюро райкому і прэзыдыум РКК прапанавалі ў двухдзенны тэрмін спагнаць цьвёрдыя заданьні па лёне і збожжы з кулацка-заможных гаспадарак.

Усе партыйныя, камсамольскія і загатоўчыя арганізацыі, сельсаветы і праўленьні калгасаў павінны арганізаваць кругласутачную апрацоўку лёну. Бюро РК КП(б)Б і прэзыдыум РКК заклікаюць ўсе арганізацыі даваць рашучы адпор рвачам, лодырам, куркульскім агентам, якія імкнуцца сарваць лёна і збожжазагатоўкі. Усе раённыя арганізацыі, сельсаветы і партячэйкі павінны ўжыць рашучыя захады да таго, каб да 26 сьнежня выканаць плян лёназагатовак ня менш, як на 80 проц. і цалкам закончыць збожжазагатоўкі.

А. НАЛЁТНЫ.

# За ГРАНІЦАЙ

## Германія

### Жабрацкая дапамога беспрацоўным

БЭРЛІН. 21-XII. Пад найскам рэактыўных рэвалюцыйных настрояў германскіх працоўных і шырокай хвалі рэвалюцыйных дэманстрацый супроць нявымайных судоў і голаду, рэйхстаг учора зацьвердзіў закон аб частковай амністыі, а савет старэйшын прыняў рашэньне аб аказаньні некаторай дадатковай дапамогі беспрацоўным. Рашэньне рэйхстагу будзе сёньня зацьверджана ўрадам, і закон аб амністыі сёньня-ж увойдзе ў моц. Частковая амністыя ахопіць каля 15 тысяч палітзьняволеных. Аднак, супроць 5 тысяч, галоўным чынам пралетарскіх зьняволеных, узьнята новае абвінавачваньне, а тэму яны, як падсьледныя, вызвалены на будуць. З турмаў павінны, у выніку прынятай амністыі, выйсьці некалькі тысяч пралетарскіх зьняволеных. Афіцыйна па амністыі будуць вызвалены зьняволеныя, якія прысуджаны ня больш чым да 5 год турмы і не абвінавачваюцца ў разбоі армії і паліцыі, а таксама асуджаныя за злачынствы, учыненыя з-за голаду. Павінны быць таксама вызвалены рабочыя, асуджаныя за парушэньне законаў у сувязі з прыняцьцем удзелу ў стачках.

Аднак, закон аб амністыі складзены так, што дае вялікія магчымасьці ў ка рысьць фашыстаў і супроць рэвалюцыйных рабочых, тым больш, што рашэньне аб вызваленьні кожнага зьняволенага будзе выносіць мясцовы суд. Улічваючы гэта, германскі камітэт МОПР-у праводзіць шырокую кампанію за правядзеньне поўнай амністыі ўсіх пралетарскіх зьняволеных.

Другое рашэньне, прынятае ўчора германскім урадам аб аказаньні зімовай дапамогі беспрацоўным, становіць сабою ня больш, як «дэмакратычны гэст», і ні ў якім разе ня можа зада воліць сапраўдныя патрэбы 7 мільёнаў галодных беспрацоўных.

Камфракцыя рэйхстагу і прускага ландтагу, а таксама цэнтральны камітэт беспрацоўных высунулі патрабаваньне, каб беспрацоўным было выдана ў якасьці дадатковай дапамогі па 5 цэнт. бульбы, 10 цэнт. вугля і дадатковая норма хлеба. Апрача таго, камфракцыі патрабавалі, каб кожнаму беспрацоўнаму было выдана ў якасьці адначасовай дапамогі па 50 марак і 15 марак на кожнага члена сям'і. Камуністы, адстойваючы гэтыя прапановы ў камісіях рэйхстагу і ландтагу, правялі адначасова шырокую работу па мабілізацыі мас беспрацоўных вакол гэтых патрабаваньняў.

Урад прымушаны быў абвясьціць, што ён асыгнуе на дапамогу беспрацоўным, у агульнай складанасьці, 40 млн. марак.

Такім чынам, на кожную сям'ю дадатковая дапамога натурай у сярэднім не перавысіць і маркі 80 пфэнігаў у месяц. «Ротэ Фане» заяўляе, што гэта падачка беспрацоўным ня можа раз глядацца інакш, як выклік, кінуты ўсім працоўным. Беспрацоўныя,—піша газэта,—павінны арганізавацца, каб рашуча змагацца за ажыцьцяўленьне праграмы, выстаўленай цэнтральным камітэтам беспрацоўных, тым больш, што няма ніякай упэўненасьці, што нават гэтыя мізэрныя абяцаньні ўраду будуць выкананы. «Бурэкуазія,—піша «Ротэ Фане»,—заяўляе, што няма грошай для аказаньня дапамогі беспрацоўным. Ці-ж склады ня ломяцца ад вугалю, бульбы і хлеба? Мы патрабуем, каб гэтыя склады былі адкрыты для галадаючых і замярзаючых працоўных.

## Ліга нацый

### Англа-пэрсыцкі канфлікт

ЖЭНЭВА. 21-XII. Міністр замежных спраў Пэрсіі Форугі ў тэлеграме на імя Лігі нацый заяўляе, што пэрсыцкі ўрад, парушаючы дагавор з англа-пэрсыцкай кампаніяй, ня меў намеру выклікаць канфлікт з англійскім урадам. Тым ня менш, пэрсыцкі ўрад з прычыны пазіцыі, занятай Англіяй, сам меў намер зьвярнуцца да Лігі нацый. Пэрсыцкі ўрад пашле свайго дэлегата ў Жэнэву з усімі матар'ялямі. Да разгляду гэтага пытаньня ў Лізе нацый ён будзе працягваць устрымліваць ад якіх-бы там ні было крокаў, здольных выклікаць канфлікт.

* * *

ЖЭНЭВА. 21-XII. «Журналь дэ Жэнэў» паведамляе, што англійскі ўрад спачатку ня меў намеру спасылацца на 15 артыкул статуту Лігі нацый у сваім звароце да савету Лігі нацый адносна разгляду канфлікту, узьніклага ў сувязі з рашэньнем пэрсыцкага ўраду разарваць канцэсыйны дагавор з англа-пэрсыцкай кампаніяй. Ён меркаваў толькі дамагацца перадачы гэтага канфлікту для разгляду гаагскаму трыбуналу. Адтак пасьля таго, як Саймон, які знаходзіўся ў Жэнэве, атрымаў з Тэгерана ад англійскага прадстаўніцтва тэлеграму, у якой паведамлялася, што Пэрсія мяркуе зьвярнуцца да Лігі нацый з пратэстам супроць спроб запалохваньня, ужываемых Англіяй у адносінах да Пэрсіі, ён наважыў забегчы наперад і спаслацца на 15 артыкул статуту Лігі нацый.

## Японія

### Баі валанцёраў з японскімі атрадамі

ШАНХАЙ. 21-XII. Агенцтва Шунсін паведамляе, што ў рэзультаце паветранай бамбардыроўкі 12 японскіх самалётаў Часлна (правінцыя Жэхэ) забіта вялікая колькасьць жыхароў. Агенцтва Гомінь паведамляе, аб нясуцільнай дзейнасьці добраахвотных атрадаў. 10-тысячны атрад пад камандаваньнем Чжан-Цзун-Сі, разьмешчаны ў Бадуне (на паўночны захад ад Чжаньчуня), рухаецца на захад для злучэньня з сіламі, якія знаходзяцца ў Кайлу (правінцыя Жэхэ). Валанцёрскія атрады пад камандаваньнем Цзянь-Це-Мей ваююць з японскімі і манчжурскімі атрадамі ў раёнах паміж Пайдзіёвай Манчжурскай чыгункай і Мукдэн-Аньдуньскай чыгункай. Валанцёрскія атрады, якія апэруюць у раёне Гаецзяцзань, зусім зьнішчылі японскі батальён, які знаходзіўся пад камандаваньнем майора Нагаока. Газэты паведамляюць аб цэлым радзе сутычак паміж японцамі і атрадамі «Вялікіх мячоў».

## Францыя

### Новы ўрад рыхтуецца да перагавораў з ПАЗШ

ПАРЫЖ 21-XII. Агенцтва Гавас паведамляе: «Габінэт міністраў сёньня распрацуе тэкст міністэрскай дэкларацыі, якая заўтра будзе прадстаўлена на зацьверджаньне савету міністраў. Вельмі магчыма, што па пытаньні аб урадавых даўгох урад даваць дэкларацыю толькі спаслацца на вотум палаты депутатаў 14 сьнежня і заявіць аб намеры ўраду ў сувязі са створаным такім чынам станові шчам, пачаць перагаворы з ПАЗШ».

## Прымусовыя лёназагатовакі

# ВЫКРЫЦЬ І СУРОВА ПАКАРАЦЬ

## зрыўшчыкаў плянаў мясазагатовак

### Аб дачы няправільных зьвестак у зводцы загадчыкам канторы Загатжывёлы у Воршы т. Крываносавым

### Пастанова Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б ад 22 сьнежня 1932 г.

1. Канстатаваць, што т. КРЫВАНОСАЎ займаўся яўным «очковтирательством», даючы няправільныя зьвесткі па загатоўках, за што падлягае выключэньню з радоў КП(б)Б. Адзак, прымаючы пад увагу яго чыстасардэчнае прызнаньне, абмяжоўваецца вынясеньнем яму суровай вымовы з папярэджаньнем і забаронай займаць адказныя пасады на працягу 2-х гадоў.

2. Прыняць да ведама паведамленьне Аршанскага раённага камітэту партыі, што т. КРЫВАНОСАЎ ужо з працы загадчыка канторай зьняты.

3. Прапанаваць гарКК-РСІ строга сачыць за правільнасьцю тых зьвестак, што даюцца загатавіцельнымі арганізацыямі і прымаць самыя жорсткія меры па партыйнай лініі ў адносінах да ўсіх членаў партыі за дачу ня правільных зьвестак аж да перадачы суду за злоснае «очковтирательство» гэтую пастанову ў друку.

Старшыня Прэзыдыуму ЦКК
Нарком РСІ І. ЛЫЧОЎ.

### Плян выкананы на 101 проц.

РАПАРТ

Пад правільным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, на аснове разгортваньня масавай работы і пры штодзённай дапамозе партарганізацыі, МАГІЛЕЎСКІ раён на 21 сьнежня выканаў плян мясазагатовак IV кварталу на 101 проц. ці на 3109 цнт.

Раённыя арганізацыі пераключаюцца на датэрміновае выкананьне пляну 1 кварталу 1933 г.

РК КП(б)Б КАЛОДКА.
РВК САПРЫЦКІ
ЗАГАТЖЫВЁЛА ЛЕЙКІН

### Чашніцкі раён дабіўся перамогі на фронце мясазагатовак

РАПАРТ

Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, на аснове разгорнутай масавай работы, барацьбы з кулацкім сабатажам, ЧАШНІЦКІ раён выканаў плян мясазагатовак IV кварталу на 101,4 проц. ці на 1992 цнт., у тым ліку адгружана 200 сьвіней на адкорм Менгарнархарчу.

РК КП(б)Б НУРЫК.
РВК—ПАПОК.
ЗАГАТЖЫВЁЛА НІСЬНЕВІЧ.

### За зрыў мясазагатовак--да суровай адказнасьці

Загад па Беларускай канторы „Загатжывёлы"

За злосны зрыў пляну мясазагатовак па ВЕТКАЎСКІМ раёне, што выявілася ў выкананьні пляну на 15 сьнежня на 50 проц., замест вызначаных 75 проц., што зьяўляецца грубым і злосным парушэньнем дырэктыў партыі і ўраду,—загадчыка Веткаўскай райконторы Загатжывёлы—тав. СТАЛЯРОВА з работы зьняць з перадачай справы пракурору.

Загадчыкам Веткаўскай райконторы Загатжывёлы прызначыць тав. Пуцейка А. С.

Кіраўнік Белканторы Загатжывёла РАШАЛ.

17 сьнежня 1932 г.
г. Менск.

### 175 проц. пляну IV кварталу

Дзякуючы добра разгорнутай шырока растлумачальнай рабоце вакол пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб мясазагатоўках, Бараўскі сельсавет (Меншчына) дабіўся значнага посьпеху ў выкананьні пляну па гэтай галіне.

Сельсаветам на сёньняшні дзень здадзена 73,7 цнт мяса, што складае 175 проц. выкананьня пляну IV кварталу 1932 г.

Гэтых посьпехаў сельсавет дасягнуў, дзякуючы мабілізацыі ўсёй грамадзкасьці, на штодзённую агіт-масавую работу сярод калгасьнікаў і адзіначасобнікаў сельсавету. Дзякуючы давядзеньню пляну да кожнага двара па некаторых паселішчах плян ўжо выкананы атулам за 15 месяцаў. Апэрацыйным кіраўніцтвам з боку сельсавету, які пэрыядычна заслухоўваў справаздачы сяброў сельсавету, дасягнута, тое што па вучастку члена сельсавету Ціхановіча С. і Чарнавусіка В. плян выкананы цалкам. Значная колькасьць гаспадарак аднаасобнікаў в. Патрэба, як Цахановіч В., Чарнавусік В. і калгасьнікі калгасу «7-я Самарская» Ціхановіч, Вальковіч і др., выканалі свае пляны за 15 месяцаў цалкам.

Толькі разгортваньне шырокай растлумачальна-выхаваўчай працы вакол перадачы вопыту мясазагатовак перадавых адстаючым, зламаўшы кулацкі сабатаж, можна дабіцца выкананьня пляну ў тэрмін.

Гэта ўсё павінна быць улічана адстаючымі сельсаветамі раёну. Гэта павінны ўлічыць адстаючыя вучасткі Бараўскага сельсавету.

Члён сельсавету і калгасу «6 зьезд саветаў» Вэлент павінен ўзяць прыклад з перадавікоў і дабіцца крутога падъёму выкананьня мясазагатовак па сваім вучастку.

В. Рыжонкоў.

### ПЕРАДАВІКІ мясазагатовак

Раёны, якія на 20 сьнежня датэрміновa выканалі плян (у проц.)

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Тураўскі | — 141,9 |
| 2. | Жыткавіцкі | — 119,5 |
| 3. | Бярэзінскі | — 115,6 |
| 4. | Менскі | — 115,9 |
| 5. | Чырвона-Слабодзкі | — 111 |
| 6. | Мсьціслаўскі | — 110,9 |
| 7. | Дрысенскі | — 103,9 |
| 8. | Заслаўскі | — 103,1 |
| 9. | Любаньскі | — 102,6 |

### АДСТАЮЧЫЯ

раёны, якія плятуцца ў хвасьце па выкананьні пляну мясазагатовак (у проц.)

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Кармянскі | — 32,8 |
| 2. | Гомельскі | — 41,1 |
| 3. | Жлобінскі | — 41,3 |
| 4. | Чачэрскі | — 41,5 |
| 5. | Уваравіцкі | — 50,2 |
| 6. | Рэчыцкі | — 53,2 |

### Аб зьлёце герояў першай пяцігодкі

У сувязі з мабілізацыяй усяго актыву на скарачэньне ўсіх відаў загатовак, зьлёт герояў першай пяцігодкі па г. Менску, у адмену пастановы сакратарыяту ГК КП(б)Б ад 5-XII—32 г., перанесьці і сумясьціць яго з правядзеньнем вечару сустрэчы 2-й пяцігодкі 31-XII—32 г.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б
ШПЭКТАРАЎ.

### Да ведама рэдакцый раённых газэт

22—23 сьнежня ў адрас усіх рэдакцый раённых газэт разасланы макеты калгасных 3-хдзённых масьцегазэт, прысьвечаных пытаньням разьмеркаваньня даходаў. Макеты разасланы з разьліку па 4 на кожны калгас.

Прымеце меры да своечасовага атрыманьня макетаў з пошты і тэрміновай рассылкі іх па месцы.

Культпроп ЦК КП(б)Б.


КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Каса ад 12 гадз.

Ад 23 сьнежня Бернардт Гетцке ў зам. маст. фільму
**Пасынкі Бэрліну**

23 сьнежня г. г. а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Гарсавету, пакой № 14

**АДБУДЗЕЦЦА НАРАДА**

старшынь сэкцый, д-груп і старшынь арцелей саматужнай, прамысловай і інвалідзкай кааперацыі.

ПАРАДАК ДНЯ

1) Папярэднія вынікі 2-х месячніку паходу ў галіне вырабу тавараў шырокажытку.

2) Заключэньне сацдагавораў і ўзяцьце шефства сэкцый і д-груп над арцелямі саматужнай, прамысловай і інвалідзкай кааперацыі.

Яўка старшынь сэкцый і д-груп і старшынь арцелей саматужнай, прамысловай і інвалідзкай кааперацыі абавязкова.

Гаркамісія

ПА РАСПАРАДЖЭНЬНІ ВКА ЗАЛІКОВАЯ СЭСІЯ
склікаемая з 1 студзеня па 15 студзеня
Завочным Сэктарам Вышэйшага Пэдінстытуту,
АДКЛАДАЕЦЦА

Аб тэрміне скліканьня завочнікі 3-га курсу, 2-га курсу 2-га прыёму, 1-га курсу 4-га прыёму будуць паведамлены асобна

ДЫРЭКТАР ВОЛКАЎ.

Віцебская школа Ф В тэкстыльшчыкаў пры ф-цы „Дзьвіна" Белдзяржтэкстыльаб'яднаньня

**абвяшчае зімовы набор**

падлеткаў на аддзяленьні ватэршчыкаў і ткачоў
У школу прымаюцца падлеткі ад 15 да 18 год з адукацыяй 4-5 клясаў

Жадаючыя паступіць павінны прадставіць наступныя дакументы:
1) аб адукацыі, 2) аб сацыяльным становішчы, 3) аб народжэньні

Залічаныя ў школу вучні забясьпечваюцца абсталяваным інтэрнатам і стыпэндыяй

Школа рыхтуе высокакваліфікаваных ватэршчыкаў і ткачоў з агульнаадукацыйнымі ведамі на ніжэй 7-мігодкі.

ТЭРМІН НАВУЧАНЬНЯ ДВА ГАДЫ

Заявы прымаюцца з 15 сьнежня 1932 г. па 10 студзеня 1933 году

Заявы накіроўваць па адрасе Віцебск, Пралетарская Слабада, школа ФЗВ пры ф-цы «Дзьвіна», прыймовай камісіі.

Загадчык школы ФЗВ пры ф-цы «Дзьвіна» ІСУРЫН.


# ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

## Беларускага Рэспубліканскага Аб'яднаньня Брадзільнай Прамысловасьці

За 1931 апэр. год

АКТЫЎ

| Назва артыкулаў балянсу. | На 1-1-1932 сума |
|---|---|
| 1. Маемасьць | 6862599—74 |
| 2. Нязкончаныя пабудовы і капітальныя рамонты | 150451—24 |
| 3. Запасное абсталяваньне | 107370—54 |
| 4. Паі і акцыі | 213[illegible]5—89 |
| 5. Уклады | 76[illegible]747—70 |
| 6. Матэрыялы і гатовыя вырабы | 706473—36 |
| 7. Сыравіна, аднаўныя і дапаможн. матар. | 1586[illegible]95—39 |
| 8. Паліва | 40561—30 |
| 9. Паўфабрыкаты | 234228—06 |
| 10. Нязкончаная вытворчасьць | 215115—45 |
| 11. Грашовыя сродкі | 235058—4[illegible] |
| 12. Разьлікі в Дзяржбанкам | 760383—54 |
| 13. Дэбіторы | 629239—65 |
| 14. Разьлікі в НКФ | 2143[illegible]51—51 |
| 15. Выдаткі будучых гадоў | 146951—93 |
| БАЛЯНС | 14606496—76 |

ПАСЫЎ

| Назва артыкулаў балянсу | На 1-1-1932 сума |
|---|---|
| 1. Статутны капітал | 5465049—20 |
| 2. Амартызацыйны капітал | 1000958—21 |
| 3. Іншы капітал | 358236—2 |
| 4. Фонды | |
| а) Фубр | 436084—11 |
| б) Іншыя фонды | 1363935—31 |
| 5. Рэзэрвы | 166880—73 |
| Бюджэтнае фінансаваньне | — |
| 7. Доўгатэрміновае | 169000—00 |
| 8. Кароткатэрміновае | 19440[illegible]—00 |
| 9. Разьлікі з Дзяржбанкам па незавізав. сумах | 424630—13 |
| 10. Крэдыторы | 762853—45 |
| 11. Разьлікі в НКФ | 444020—51 |
| 12. Даходы будучых год | 1545—61 |
| 13. Прыбытак | 3813902—78 |
| БАЛЯНС | 14606496—76 |

## РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ

СТРАТЫ

| | Сума |
|---|---|
| 1. Розьніца паміж разьлік. цэнамі выпрацаван. вырабаў і сабекоштам | 382703—74 |
| 2. Пропаўты аплачаныя | 14660—26 |
| 3. Агульна-адміністрац. выдаткі, | 16475—9 |
| 4. Выдаткі па абмене (у т. л. падатак са звароту 12007009-81) | 13820755—64 |
| 5. Іншыя выдаткі | 706668—08 |
| 6. Чысты прыбытак | 3813902—78 |
| БАЛЯНС | 18835166—43 |

ПРЫБЫТКІ

| | Сума |
|---|---|
| 1. Ад рэалізацыі гатовых вырабаў і матар'ялаў | 18560556—75 |
| 2. Пропаўты атрыманыя | 29712—90 |
| 3. Іншыя прыбыткі | 244896—78 |
| БАЛЯНС | 18835166—43 |

Кіраўнік Белбрадаб'яднаньня МАЎЧАН
ОЭС РАБІНОВІЧ
Галоўны Бухгальтар КЛЕЎКО

Гэты балянс разгледжаны і зацьверджаны Балянсавай камісіяй Наркамснабу БССР і дазваляецца апублікаваньню ў друку

Нач. фінсэктару НКСнабу БССР (подпіс).

## Сьнежаньская сэсія Акадэміі навук БССР

За два дні работы сэсія Акадэміі Навук БССР заслухала даклады:

Акадэміка КЕДРАВА - ЗІХМАНА—«аб праблеме хімізацыі земляробства ў БССР»; праф. Г. І. ПРАТАСЕНЯ—«праблема хімізацыі с-г БССР»; праф. Маскоўскага Дзяржкаўнага Універсытэту Н. М. КУЛАГІНА—«аб агранамічных мерапрыемствах з пункту погляду барацьбы з мэзуркамі»; інфар мацыю вядомага савецкага вучонага-фізыялёга праф. ШТЭРНА—«аб XIV міжнародным зьезьдзе фізыялёгаў (які адбыўся ў г. Рыме тры месяцы таму назад); даклад вучонага спэцыяліста Н. А. ДАРОЖКІНА—«аб ролі хімії ў барацьбе з хваробамі с-г культур БССР».

На гэтым скончыўся цыкль даклядаў па першай праблеме, стаяўшай перад сэсіяй—хімізацыяй земляробства БССР.

21 сьнежня на вячэрнім пасяджэньні сэсія заслухала даклад праф. КАЙГАРОДАВА — «Кліматычныя магчымасьці БССР у справе ўзьнятьня ўраджайнасьці» і раніцою 22 сьнежня—даклад акад. Я. Н. АФАНАСЬЕВА—«Натуральны і культурны рэльеф палёў БССР, як фактар ураджайнасьці, паводле даных дасьледваньняў атраглебавага інстытуту АН БССР за 1931-32 г.».

Гэтымі дакладамі сэсія распачала працу па другім цыклі абвесткі дня сэсіі—«Прыродныя і кліматычныя ўмовы БССР і праблема ўзьнятьня ўраджайнасьці».

▲ 22 сьнежня прыехаў у Менск для ўдзеле ў рабоце сэсіі Акадэміі Навук БССР дырэктар Усесаюзнага эканамічнага інстытуту праф. ЛУР'Е.

▲ Сэсіяй Акадэміі Навук БССР атрыманы прывітальныя тэлеграмы ад прэзыдыуму Акадэміі Навук СССР і Украінскай Акадэміі Навук.

Абедзьве Акадэміі жадаюць сэсіі поўнага посьпеху ў вырашэньні важнейшых пытаньняў падняцьця ўраджайнасьці сельскае гаспадаркі БССР.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу А—53.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Друкарня імя СТАЛІНА